27.03.2015

# Прэзентацыя факсімільнага выдання “Тураўскае Евангелле”



26 сакавіка 2015 года ў ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” адбылася прэзентацыя факсімільнага выдання кніжнага помніка стараславянскай пісьменнасці XI ст. “Тураўскае Евангелле”.

Тураўскае Евангелле – самы старажытны помнік кніжнай культуры на тэрыторыі Беларусі, створаны ў XI ст. у Тураўскім манастыры, які на працягу некалькіх стагоддзяў нараўне з Полацкім быў цэнтрам перапісу кніг.

Богаслужэбныя кнігі ў старажытнасці дбайна зберагаліся ў храмах, перадаваліся як найвялікшая каштоўнасць ад продкаў да нашчадкаў, нярэдка выступалі як сховішчы дакументаў – на палі гэтых кніг заносіліся рознага кшталту дароўныя, дамоўныя, купчыя і іншыя запісы. На тураўскіх лістках таксама захаваліся запісы, якія належаць князю Канстанціну Іванавічу Астрожскаму. Першы запіс зроблены на пачатку XVI ст. З яго відаць, што князь Астрожскі з сям’ёй падараваў Спаса-Праабражэнскай Тураўскай царкве і яе тагачасным святарам сельскагаспадарчыя ўгоддзі: пчаліную пасеку, поле, возера, сенажаці… Запіс зроблены на Евангеллі невыпадкова. Евангелле ў Тураве лічылася свяшчэнным. А зрабіць дароўны запіс на ім – вялікая пашана.

Рукапіс быў знойдзены выпадкова, у скрыні з-пад вугалю двума ўдзельнікамі археалагічнай экспедыцыі, арганізаванай Віленскай вучэбнай акругай. У 1865 годзе знаходку прывезлі ў Віленскую публічную бібліятэку. Зараз Евангелле захоўваецца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх.

У Рэспубліцы Беларусь факсімільныя копіі надрукаваны па ініцыятыве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сумесна з кампаніяй Xerox.

Гэтае выданне атрымала перамогу ў намінацыі “Духоўнасць” у 54-м Нацыянальным конкурсе “Мастацтва кнігі”.

Удзел у мерапрыемстве прымалі: галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Машканцава І.П., намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Суша А.А., праваслаўныя святары Ігар Данільчык і Антоній Семілет, навукоўцы, краязнаўцы, члены Саюза пісьменнікаў

Беларусі, кіраўніцтва бібліятэчных і музейных устаноў Гродзеншчыны, чытачы абласной бібліятэкі.

Доктар гістарычных навук, дацэнт УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы" Сілава С.У. зрабіла гістарычны экускурс у мінулае і пазнаёміла прысутных з асноўнымі падзеямі жыцця нашых продкаў у XI ст., а прафесар Пяткевіч А.М., вядомы літаратуразнавец і краязнавец, распавёў пра гісторыю рукапісных Евангелляў на Беларусі.

Факсімільнае выданне "Тураўскае Евангелле" было перададзена ў фонды Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага, Гродзенскай гарадской, Іўеўскай і Навагрудскай бібліятэчных сістэм, навуковай бібліятэкі УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы", а таксама УК "Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей" і УК "Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі".

Супрацоўнікамі аддзела інфармацыйна-бібліяграфічнай работы была падрыхтавана выстава літаратуры "Вытокі нашай духоўнасці", якая ўключала рэдкія і факсімільныя выданні з фонду абласной бібліятэкі, а таксама матэрыялы, якія адлюстроўваюць этапы развіцця кнігадрукавання на тэрыторыі Беларусі.










